– знать формы и типы культур, основные культурно-исторические центры и регионы мира, закономерности их функционирования и развития, историю культуры своей страны, ее место в системе мировой цивилизации.

Из сказанного следует, что приоритетное развитие сферы социально-гуманитарного образования и науки способствует реализации личностью потенциала материальной и духовной культуры.

*Политико-правовые* ценности: история и современность / Под ред. В.С.Нерсесьянца. – М., 2000. – 256 с.

*Родригес А.М.* Нефть и эволюция социальных структур аравийских монархий. – М., 1989. - 259 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А.В.Няборская,** *аспірантка*

## “ПАЭТЫКА” МАЦЕЯ КАЗІМІРА САРБЕЎСКАГА І ЯЕ РОЛЯ Ў РАЗВІЦЦІ ТЭАТРА І АСОБЫ МАСТАКА

З'яўленне новага напрамку ў мастацтве немагчыма без пераасэнсавання ролі ў ім самога чалавека. А хто ён, гэты чалавек, творца свайго часу? Кожная эпоха прапануе свае прыклады для пераймання.

Полацкая езуіцкая калегія праславілася ў 20-я гады XVII ст., калі там працаваў і пісаў свае арыгінальныя даследаванні славуты паэт, тэарэтык літаратуры і красамоўства, філосаф, тэолаг і музыка Мацей Казімір Сарбеўскі (1595 – 1640). Нарадзіўся ён у фальварку Сарбева каля Плоцка (Польшча). Семнаццацігадовым юнаком прыехаў у Вільню, быў прыняты ў ордэн езуітаў і вучыўся ў Віленскай акадэміі з 1612 года па 1617 год. Пасля заканчэння акадэміі два семестры працаваў настаўнікам граматыкі і рыторыкі ў заснаванай Я.К.Хадкевічам езуіцкай гімназіі ў Крожах

(Літва). Як вучоны-гуманіст Сарбеўскі ўпершыню праславіўся менавіта ў Полацку: там ён быў настаўнікам рыторыкі і паэтыкі (1618–1620), пачаў даследаванні па тэорыі паэзіі, пісаў аказіяльныя ("на выпадак") вершы, урачыстыя оды і лірычныя песні. Каля двух гадоў слухаў курс тэалогіі ў Віленскім універсітэце, адкуль яго паслалі ў Рым.

У Італіі Сарбеўскі стажыраваўся каля чатырох гадоў (1622–1625), вывучаў тэалогію, філасофію і літаратуразнаўства. За гэты час ён падрыхтаваў шматлікія матэрыялы па антычнай гісторыі, закончыў арыгінальнае даследаванне "Пра вытанчанасць і дасціпнасць".

З Італіі Мацей Казімір прыехаў у Полацк, некалькі семестраў (1626 – 1627) чытаў у езуіцкай калегіі універсітэцкія курсы па тэорыі паэзіі, красамоўстве і герменеўтыцы антычнай культуры. Матэрыял курсаў захаваўся ў рукапісных зборніках, якія былі апублікаваны ў 1954–1972 гадах Польскай акадэміяй навук па-латыні і ў польскім перакладзе пад назвамі "Пра дасканалую паэзію, альбо Вергілій і Гамер" (1954), "Лекцыі па паэтыцы" (1958) і інш. У рукапісах курсаў лекцый па тэорыі паэзіі, якімі маглі ганарыцца тагачасныя еўрапейскія універсітэты, ёсць паметкі, што яны "запісаны ў Полацку за прафесарам Сарбеўскім у 1626–1627 гг." [3, с.6]. Полацкі курс паэтыкі, які па сваёй структуры і змесце ўжо тады быў універсітэцкім, а не школьным, з'яўляецца найбольш каштоўнай навуковай працай славутага тэарэтыка мастацтва.

Гуманіст па сваіх светапоглядах, Сарбеўскі абапіраўся на антычную і рэнесансную навуку, найперш на папулярную тады ў Еўропе кнігу Скалігера "Сем кніг паэтыкі" (Ліён, 1561). Але ж ён адмовіўся ад сярэдневяковай догмы, паводле якой паэзія і мастацтва – служанкі рэлігіі. Паэзія, на яго думку, – гэта сфера духоўнай свабоды, яе нельга абмежаваць утылітарнымі мэтамі. Канцэпцыя мастацкага свету як ідэальнай рэальнасці была апазіцыйнай да сярэдневяковых уяўленняў пра мастацтва як своеасаблівае рамяство. З творчасцю Сарбеўскага даследчыкі звязваюць эпоху станаўлення і ўздыму той плыні мастацтва і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкага стылю XVII ст., якая сёння абазначаецца паняццем барока. Барочная культура па-свойму сінтэзавала сярэдневяковы ідэалізм і рэнесансны рэалізм, перанесла творча-стылёвыя акцэнты з тэорыі адлюстравання на эстэтыку тварэння. Прапаведуючы новую эстэтыку, Сарбеўскі і сам быў прыкладам новага тыпу вучонага, пісьменніка і асветніка. Па яго словах, мастак, адштурхоўваючыся ад рэальнага жыцця, фарміруе прынцыпова новую, мастацкую рэальнасць.

Сарбеўскі строга адрозніваў паняцці гістарычнай (праўды факта) і мастацкай праўды, паколькі мастацтва, па яго перакананні, заклікана не пратакаліраваць рэчаіснасць, а паказваць магчымае і неабходнае, ідэал або агульную ідэю ў канкрэтным вобразе. У самім жа паняцці мастацкай (паэтычнай) праўды ён адрозніваў некалькі сэнсавых значэнняў:

1) пазнавальная ісціннасць мастацтва (яно дае нам звесткі з розных навук і мастацтва);

2) мастацкая праўда як адпаведнасць ідэі твора і яе знешняга выяўлення;

3) схаваная, або сімвалічная, праўда;

4) праўдападобнасць характараў і акалічнасцей;

5) праўдзівасць як паслядоўнасць характараў, іх адзінства;

6) мастацкая праўда як ідэал;

7) мастацкая праўда як паэтычнае прароцтва.

Асноўную камунікатыўную нагрузку, на думку Сарбеўскага, нясуць эпічная фабула і лірычная экспрэсіўнасць, яны выяўляюць усю гаму людскіх учынкаў, думак і пачуццяў. Свет мастацтва – гэта быццам бы новая, штучна створаная рэчаіснасць, якая, гаворачы сучаснай мовай, "прэтэндуе на структурную рэпрэзентатыўнасць у адносінах да аб'ектыўнай рэчаіснасці" [2, с. 121].

Школьны тэатр выпрацаваў не толькі строга нарматыўную тэорыю драматургіі, але і выканаўчага мастацтва. М.К.Сарбеўскі ў сваёй "Паэтыцы" шмат увагі надае жанравай спецыфіцы спектакляў і абумоўленай ёю адметнасці ігры акцёраў. Ён робіць некалькі заўваг адносна сцэнічнай тэхнікі. Што датычыцца ігры на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэне і дыкцыі, то трагедыя патрабуе свабоднай, сур'ёзнай, энергічнай жэстыкуляцыі. Трагедыя знешне павінна адрозніваецца, напрыклад, спосабам вымаўлення прамоў аратараў і звычайных людзей. Паводле Сарбеўскага, характэрны для трагедыі і спосаб хаджэння – "па-сапраўднаму катурнавы, г. зн. звысоку, з паваротам усяго корпуса то адным, то другім бокам" [4, с. 17]. Акрамя таго, "голас павінен быць асабліва гучным, поўным, моцным; кожнае слова павінна вымаўляцца выразна, вытанчана, узнёсла. Акцёр камічны ў нізкіх чаравіках павінен выступаць звычайнай паходкай, гаварыць звычайным тонам, з памяркоўнымі рухамі цела, голасам большаю часткай не напружаным" [1, с. 147].

М.К.Сарбеўскі падкрэслівае, што прадстаўленне павінна ўзнаўляць дзеянні не толькі словамі і мовай, але і жэстам, інтанацыяй, рухамі па сцэне, адпаведным настроем. Важная роля пры гэтым надавалася музыцы, машынам і абстаноўцы. Калі дзеянне ствараецца або рэгулюецца мастацтвам, то гэта ж датычыцца і асвятлення, пры якім даецца спектакль, бо відавочна, што адпаведна разнастайным патрабаванням у залежнасці ад настрою, то сумнага, то прыемнага, штучнае святло можна ўзмацняць і памяншаць. Спасылаючыся на практыку італьянскага тэатра, К.Сарбеўскі прапаноўвае некалькі іншую сістэму тэларый. Ён лічыць, што іх павінна быць шэсць (па тры з кожнага боку сцэны), а не чатыры, як раней, і яны павінны быць чатырохграннымі. Тэларыйную перспектыву, у адпаведнасці з яго класіфікацыяй, замыкала "задняя дэкарацыя". Прыём, прапанаваны К.Сарбеўскім, заключаўся ў тым, што чатырохгранныя прызмы "задняй дэкарацыі" павінны быць пастаўлены ў рад (адной са сваіх плоскасцей уздоўж лініі, паралельнай люстры сцэны) і па вертыкалі дзяліць заднік на некалькі прамавугольных фрагментаў.

Спадчына Сарбеўскага багатая і разнастайная. Свае вершы ён пісаў толькі на класічнай латыні, з-за чаго сучаснікі называлі яго "польскім Гарацыем". Але гэта хутчэй метафара, чым рэальнасць, бо не знойдзена ніводнага яго твора на польскай мове. Пісаў ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

найбольш, калі працаваў у Беларусі і Літве, хоць па выхаванні і літаратурнай традыцыі належаў да адукаванай польскай шляхты.

Разважанні, заўвагі і рэкамендацыі знайшлі працяг у трактаце "Пра трагедыю і камедыю", дзе поруч з вызначэннем спецыфікі драматургічных жанраў ёсць падрабязныя практычныя настаўленні па сцэнаграфіі і рэжысёрскім мастацтве, праілюстраваныя схемамі і чарцяжамі. Пазней элементы сцэнаграфіі школьнага тэатра выкарысталі ўсе плыні тэатральнага мастацтва – ад класіцызму і псіхалагічнага рэалізму да мадэрнізму і "тэатра абсурду". А асобныя палажэнні "Паэтыкі" М.К.Сарбеўскага не адмаўляюцца і зараз.


1. *Гісторыя* беларускага тэатра. Т. 1: Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983.

2. *Конан У. М.* Полацкі курс паэтыкі М.К.Сарбеўскага (1618 – 1627 гг.) // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. –1972. –№ 1. – С. 114 – 122.

3. *Конан У.* Слова пра Мацея Казіміра Сарбеўскага // Культура. –1992. – 14 снежня (№ 48) – С.6.

4. *Сарбевский М. К.* О совершенной поэзии, или Вергилий и Гомер / Пер. с польск. П.Ф.Стефановича. – Мн, 1981.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


**Н.В.Павлова,** *доцент*
**Г.И.Степанов,** *доцент*


## МЕСТО СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫХ НАУК В ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПОДГОТОВКЕ СТУДЕНТОВ

Анализ современного состояния образовательной сферы трансформирующегося общества дает основание говорить о необходимости прогнозирования образования постсоветского социума, понимания соотношения концепции национального обра-